Примечание: участники конференции имеют право задавать вопросы по представляемым темам.

Таким образом, представленная технология проведения зачета позволяет: принципиально изменить тип оценивания, при котором оно уже не является привилегией преподавателя и касается лишь результата учебной деятельности; целесообразно сочетать оценку преподавателя и самоконтроль знаний со стороны слушателей; использовать аттестацию слушателей как обучающее средство.

*Список использованных источников*

1. Использование технологии коллективного взаимообучения в учебном процессе: метод. рек./ сост. А.И. Андарало, Е.С. Шилова. – Минск: БГПУ,2003.
2. Шилова, Е.С. Реализация рефлексивного подхода в технологии проектного обучения// Материалы Международ Шилова, И.В. Шеститко. – Минск, БГПУ, 2007.
3. Пуйман, С.А. Практикум по педагогике: пособие / С.А. Пуйман, В.В. Чечет. – Минск: Тетра Системс, 2003.

## СТРУКТУРА КОЛЕРАЗНАЎЧЫХ ЗАНЯТКАЎ ВА ЎМОВАХ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ

*К.Л. Баброўская*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Агульнапрынятым лічыцца, што кожны народ мае свае нацыянальныя колеры, а таксама вызначаную пэўную палітру. Вылучэнне тых ці іншых этнаколераў тлумачыцца звычаямі і традыцыямі, геаграфічнымі ўмовамі і гістарычным лёсам, эстэтычнымі нормамі і рэлігійнымі прыярытэтамі, характарам і тэмпераментам нацыі. Напрыклад, зялёны (свяшчэнныя сцягі Магамета) і белы (Аллах) – дамінуючыя колеры мусульман, якія абапіраюцца на рэлігійную дагматыку. Геаграфічныя ўмовы пражывання (клімат, расліннасць, водная прастора) і аддаленнасць ад экватару выяўляецца ў прыярытэтах людзей да цёплых колераў (дамінуючыя жоўты і чорны характэрны для іспанцаў) і да больш халодных (белы і сіні – этнаколеры фінаў). Гістарычныя ўмовы барацьбы (левыя і правыя групоўкі, кроў вайны і чыстыя сцягі) і касмаганічныя ўяўленні ўсходніх славян (пра жыццё і смерць) адзначаюць прыхільнасць да чырвонага і белага колераў. Бачна, што колеры з’яўляюцца эстэтычнымі і духоўнымі эквівалентамі рэальнасці і накіраваны на візуальнае падкрэсліванне дзяржаўнай, рэгіянальнай, сацыяльнай і культурнай постаці нацыі. Яны фіксаваліся ў свядомасці нашых продкаў і перадаваліся праз фальклорны вопыт. Такім чынам, патрыятычнае выхаванне будучых педагогаў, якія будуць навучаць наступныя пакаленні, немагчыма без тлумачэння і разумення каларыстыкі роднай нацыі.

Дзякуючы даследаванням беларускіх навукоўцаў (В. Вячорка, Н. Гілевіч, І. Казакова, Я. Крук, М. Ткачоў) нацыянальнымі колеравымі этнадамінантамі з’яўляюцца чырвоны і белы [3, 4, 5, 6]. Але іх высновы абапіраюцца на суб’ектыўны

аналіз фальклорных матэрыялаў, які не мае канкрэтных лічбавых пацверджанняў. Таму прапануем правядзенне з навучэнцамі адукацыйных установ колеразнаўчых заняткаў па дадзенай структуры з выкарыстаннем праблемнага метаду творчага пошуку вырашэння мэты.

Мэта заняткаў – вылучэнне этнаколераў на аснове тэкставых матэрыялаў экспедыцый і даследаванняў беларускіх навукоўцаў XX ст., сабраных па ўсёй тэрыторыі рассялення нацыі, якія прадстаўлены ў серыі тамоў “Беларуская народная творчасць” (далей БНТ). Задачы, якія ставяцца перад навучэнцамі, абапіраюцца на мэту: статыстычна падлічыць, якія колеры часцей за ўсё ўспамінаюцца ў абраных тамах серыі БНТ; правесці семантычны аналіз колералексем, які дазваляе раскрыць зашыфраваны сэнс. Бачна, што ў дадзеным выпадку навучэнцы непасрэдна самі прыдуць да высновы, якія дамінуючыя колеры характэрны нашай нацыі (лічбавы падлік і градацыя) і што яны азначаюць для беларуса (семантычны аналіз).

Для больш цеснага кантакту навучэнцаў з праблематыкай колеразнаўчых заняткаў неабходна прытрымлівацца структуры, якая абапіраецца на ўзбуджэнне патрыятычнай самасвядомасці. Першы этап – актуалізацыя папярэдніх ведаў па тэме. Мэта яго: успомніць і актуалізаваць веды аб нацыянальных колерах і іх сімволіцы, каб выявіць недахопы або вызначыць ступень іх трываласці, што неабходна для асэнсаванага ўспрыняцця праблемы. На гэтым этапе можна праводзіць франтальнае апытанне, размову, для фарміравання праблемнай сітуацыі. Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы: фарміруецца ўменне суадносіць сваё патрыятычнае стаўленне і веды з агульнапрынятымі, вызначаць кола іх супадзення або праблематыку адрозненняў.

Другі этап – аналіз праблемнай сітуацыі. Мэта: зразумець пачатковыя ўмовы – якія колеры лічыліся нашым народам найбольш значнымі, як гэта адлюстравана ў фальклоры, ці захавалася сёння іх вызначэнне як дамінуючых, адкуль бяруцца і на чым будуюцца разнастайныя думкі тлумачэння каляронімаў. Пастаноўка праблемнай сітуацыі, расповяд выкладчыка, калектыўнае абмеркаванне – шляхі рэалізацыі дадзенага этапа. Вынік: разуменне існавання нейкай неадпаведнасці або няўпэўненасці ў трываласці матэрыялу. Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы: фарміруецца ўменне адказна адносіцца да разнастайных пазіцый разумення нацыянальных этнаколераў, карэкцыя свайго пункта гледжання.

Трэці этап – вызачэнне канкрэтнай праблематыкі: што невядома пра этнаколеры, якія з іх вызначаюцца як дамінуючыя і ці пацвярджаецца гэта ў вуснай народнай творчасці, зафіксаванай у тамах серыі БНТ. У гэты перыяд можна праводзіць працу па групах (“розумавы штурм”), індывідуальныя разважанні-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выступленні, калектыўнае абмеркаванне, абагульненне выкладчыка. Вынік: вербальная пастаноўка мэты і задач – вылучэнне этнаколераў на аснове статыстычнага падліку колералексем у тамах серыі БНТ, іх усебаковы аналіз (лінгвістычны, семантычны, міфалагічны). Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы: развіццё самастойнасці меркаванняў, вызначэнне свайго патрыятычнага “Я” ў пытанні нацыянальных колераў, фарміраванне павагі да выказванняў іншых і ўмення будаваць дэмакрытычныя зносіны ў калектыве.

Чацвёрты этап – вылучэнне гіпотэз: чаму неабходна пацвердзіць або растлумачыць іншыя дамінанты колераў, якія лічацца для беларусаў нацыянальнымі; як можна выявіць іх градацыю, чаму гэта трэба рабіць на аснове фальклорнага матэрыялу, сабранага ў тамах серыі БНТ. Гэтыя пытанні можна абмяркоўваць як у групах, так і франтальна, абавязковым з’яўляецца канчатковае вызначэнне гіпотэз. Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы: развіваецца глыбіня мыслення, уменне аналітычна і прагнастычна аналізаваць дадзеныя, фарміраваць патрыятычнае стаўленне да абмеркаваных пытанняў.

Найбольш важны і складаны этап ва ўсім працэсе – пяты – вырашэнне пытанняў праз прастору пошукаў. Мэта: распрацаваць кожную гіпотызу, змястоўна і ўсебакова раскрыць сэнс, правесці самастойныя пошукавыя даследаванні, знайсці факты для пацвярджэння або адмаўлення гіпотэз. Дзякуючы статыстычнаму падліку пабудаваць градацыю колеравых абазначэнняў у тэкстах, вылучыць дамінуючыя колералексемы. Шляхам усебаковага аналізу растлумачыць: чаму найбольш папулярна выкарыстанне тых або іншых колераў. Вынік: вызначэнне этнаколераў характэрных для вуснай народнай творчасці беларусаў. Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы: асэнсаванае далучэнне да народнай культуры, атаясамліванне сябе з носьбітам духоўных каштоўнасцей нацыі.

Падагульняючы этап – шосты, дзе адбываецца сумаванне ўсіх ведаў, доказ або адхіленне гіпотэз. Яго можна праводзіць у выглядзе: групавой працы; франтальнай размовы (калектыўны доказ з кіраваннем выкладчыка); міні-лекцыі або тлумачэння (разважанні настаўніка). Вынік: абгрунтаваць гіпотэзу па схеме “пытанне – даследаванне – доказ”. Паколькі прапанаванае пытанне аб этнаколерах беларусаў было даследавана намі ў папярэдніх артыкулах і працах па дадзенаму ўзору, можна з упэўненнасцю сказаць, што нацыянальнымі колерамі з’яўляюцца белы і чырвоны. Гэта пацвярджаецца лічбавым падлікам (сярод 2811 запісаных матэрыялаў каляндарных песень, замоў і загадак, дзе сустракаюцца колералексемы, у 993 тэкстах узгадваецца белы і ў 633 – чырвоны колеры) і аналізам фальклорных матэрыялаў [1, с. 79-81; 2, с. 96-101]. Спектр змен патрыятычнай свядомасці асобы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзякуючы грунтоўнаму даследаванню фарміруецца нацыянальная годнасць, любоў да свайго народа і спадчыны, развіваюцца пачуцці этнічнага гонару, павагі і ўсхвалення Беларусі.

Найважным заключным этапам з'яўляецца рэфлексія, дзе навучэнцы абмяркоўваюць свае думкі і пачуцці, тлумачаць і выказваюць свае пазітыўныя адносіны.

Такім чынам, дзякуючы прапанаванай структуры колеразнаўчых заняткаў вызначаюцца пэўныя этнаколеры і тлумачыцца іх семантыка ў культуры і фальклоры, што з'яўляецца важным універсальным этнапрыярытэтамі нацыі. Сімволіка колераў патрыятычна, духоўна, эстэтычна выхоўвае маладое пакаленне. Як казаў М.Ткачаў: "Калі пачынаеш аналізаваць колеравую гаму нашай старажытнай нацыянальнай сімволікі, міжволі адчуваеш глыбокую павагу да тых далёкіх продкаў, якія ў сімвалах і колерах абуджалі ў сваіх сучаснікаў самыя лепшыя чалавечыя і грамадзянскія якасці. Усё гэта адрасавна і нам, у сённяшні дзень" [6, с. 340]. Прапанаваная педагагічная структура вывучэння этнаколераў абуджае і ўзбагачае патрыятычную годнасць будучых педагогаў.


*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Баброўская, К.Л. Каляровая дамінанта магічнага слова беларусаў / К.Л. Баброўская // Студенческая наука как фактор личностного и профессионального развития будущего специалиста: материалы V студ. науч. конф., г.Минск, 24 апр. 2009 г. / Белларус. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. В.В. Бущик [и др.] – Минск: БГПУ, 2009. – С.79-81.
2. Баброўская, К.Л. Колеравая палітра беларускіх народных песень / К.Л. Баброўская // Фалькларыстычныя даследванні: Канэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. Вып. 6 / пад нав. рэд. В.В. Прыемка, Т.А. Марозавай. – Мінск: Беспрынт, 2009. – С. 96-101.
3. Вячорка, В. "Кроў лягла чырвонай паласой…" / В. Вячорка // З гісторыяй на "Вы": Публіцыстычныя артыкулы / уклад. У. Арлова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. – С. 355-372.
4. Казакова, І.В. Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры / И.В. Казакова. – Мінск, 1997.
5. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2001.
6. Ткачоў, М. Нацыянальныя сімвалы: народ і гісторыя / М. Ткачоў // З гісторыяй на "Вы": Публіцыстычныя артыкулы / уклад. У. Арлова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. – С. 331-354.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПУТИ ОПТИМИЗАЦИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ЛИЧНОСТНОГО РАЗВИТИЯ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ


*И.А. Белокурская*

*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка*


Одной из важнейших задач учебного и воспитательного процесса в педагогическом вузе является подготовка профессионально-грамотного, компетентного и ответственного специалиста, формирование в нем качеств, необходимых для будущей профессиональной деятельности. В отечественной психологической науке в исследованиях А.К. Марковой, С.В. Кондратьевой, Л.М. Митиной и других широко разработана общая структура субъектных свойств педагога, определяющих эффективность педагогической деятельности. Весомую роль в личностной характеристике педагога играет профессиональное